**В.А.Какшынская,** *аспірантка,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДЛЕТКАЎ-ЧЫТАЧОЎ

Гістарычны шлях светаўспрымання, адлюстраваны ў філасофскіх канцэпцыях, з’явіўся фундаментам фарміравання і развіцця навукова-даследчых педагагічных падыходаў, сярод якіх у кантэксце праблемы нашага даследавання мы вылучаем асобасна арыентаваны, дзейнасны, сістэмны. Паміж азначанымі падыходамі існуюць глыбокая ўзаемасувязь і ўнутранае адзінства, гэта тлумачыцца ўзаемасувяззю тых катэгорый, якія ляжаць у аснове кожнага з іх. Разгледзім больш падрабязна гэтыя падыходы.

*Асобасна арыентаваны падыход* у педагогіцы сфарміраваўся ў сярэдзіне XIX ст.

У канцы XX ст. праблемам асобасна арыентаванага падыходу ў педагогіцы надавалася вялікая ўвага расійскімі навукоўцамі (Ш.А.Аманашвілі, Ю.К.Бабанскім, Э.У.Ільенковым, У.А.Каракоўскім, У.У.Серыкавым) [1; 2; 3; 4; 5]. Гэты падыход прадвызначае ўлік прыродаадпаведных асаблівасцей падлетка, стварэнне ўмоў для паўнацэннага праяўлення і развіцця яго асобасных якасцей. Згодна з асобасна арыентаваным падыходам экалагічнае выхаванне павінна абапірацца на патэнцыяльныя магчымасці падлетка, якія з дапамогай бібліятэкі неабходна развіваць, удасканальваць і ўзбагачаць. Гэта магчыма ажыццявіць, выкарыстоўваючы індывідуальны падыход. Стратэгіяй індывідуальнага падыходу з’яўляецца выкарыстанне ў абслугоўванні падлеткаў і вызначэнні накіраванасці іх чытання ўнутраных рэзерваў асобы – матываў, інтарэсаў, эмоцый, схільнасцей, што ў выніку садзейнічае развіццю прыродных задаткаў.

Асобасна арыентаваны падыход дае магчымасць стварыць асаблівае бібліятэчнае асяроддзе для праяўлення матывацыі, выбару, самарэалізацыі падлетка. Зыходным пунктам падыходу з’яўляецца аб’ектыўнае ўяўленне бібліятэкара аб асобе падлетка і механізмах фарміравання яго светаўспрымання ў працэсе экалагічнага выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі складовымі асобасна арыентаванага падыходу з’яўляюцца пазіцыя падлетка, якая рэалізуецца на ўсіх этапах эколага-выхаваўчага працэсу; улік індывідуальных асаблівасцей падлетка як чытача, што забяспечваюць эфектыўнасць выкарыстання розных формаў і метадаў інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання. Пры гэтым улічваюцца як асаблівасці тэмпераменту і характару падлеткаў, так і пэўныя характарыстыкі псіхічных працэсаў: памяці, мысліцельных аперацый, увагі, успрымання і інш. Асобасна арыентаваны падыход патрабуе не толькі ўвагі да асабістай актыўнасці суб’екта, але і яе зместу. Перш за ўсё гэта ўлік пры арганізацыі выхаваўчага працэсу сістэмы матываў і запытаў чытача-падлетка.

У цэнтры такой сістэмы – развіццё асобы чытача-падлетка, а дзейнасць выступае ў якасці сродку фарміравання яго экалагічнай культуры. Асаблівасцямі экалагічнага выхавання падлеткаў-чытачоў на аснове асобасна арыентаванага падыходу з’яўляюцца арыентацыя бібліятэкарам падлеткаў на самастойную чытацкую дзейнасць, выяўленне іх чытацкіх пераваг і здольнасцей, падбор інфармацыйных рэсурсаў з улікам патрэб кожнага падлетка, прадастаўленне яму магчымасці ўдзелу ў комплексе масавых мерапрыемстваў.

Для рэалізацыі асобасна арыентаванага падыходу ў публічнай бібліятэцы неабходна стварэнне пэўнага асяроддзя, псіхалагічнага мікраклімату, які паўплывае на набыццё ведаў і ўменняў у галіне экалогіі, забяспечыць гатоўнасць падлетка да адаптацыі, самаактуалізацыі і самавыражэння ў грамадстве, будзе спрыяць фарміраванню ўстаноўкі на сцвярджэнне і рэалізацыю пазітыўнай “Я-канцэпцыі”.

Асобасна арыентаваны падыход звязаны з *дзейнасным падыходам*, які патрабуе ўліку ўзроўню сацыялізацыі асобы падлетка, мэтавых установак, каштоўнасных арыентацый.

Абгрунтаваны дзейнасны падыход у працах Л.С.Выгоцкага, П.Я.Гальперына, В.В.Давыдава, А.М.Лявонцьева, Л.С.Рубінштэйна [6; 7; 8; 9; 10]. Сутнасць дзейнаснага падыходу заключаецца ў тым, што авалоданне зместам экалагічнага вопыту, назапашанага чалавецтвам, павінна ажыццяўляцца не толькі шляхам атрымання экалагічнай інфармацыі, але і ў працэсе актыўнай дзейнасці суб’екта.

Сутнасны бок дзейнаснага падыходу ўключае каштоўнасныя арыентацыі, якія выступаюць у якасці ўстаноўкі, што рэгулюе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паводзіны і дзейнасць асобы. Яны адлюстроўваюць фундаментальныя сацыяльныя інтарэсы асобы і вызначаюць стратэгічную накіраванасць яе дзейнасці. Каштоўнасныя арыентацыі праяўляюцца як жыццёвая пазіцыя індывіда, яго светаўспрыманне, маральныя прынцыпы. Выкарыстанне дзейнаснага падыходу дазваляе сфарміраваць у чытачоў экалагічныя перакананні, падрыхтаваць іх да дзейнасці па ахове прыроды, прапагандзе экалагічных ведаў. Рэальнае месца асобы падлетка ў жыцці вызначаецца не толькі думкамі, але і справамі, практычнымі паводзінамі.

Інструментам, які дазваляе аб'яднаць выхаваўчыя працэсы ў адзінае цэлае, з'яўляецца *сістэмны падыход*.

Ён трактуецца як сукупнасць, комплекс узаемадзеючых кампанентаў, аб'яднаных сувязямі ў адзінае цэлае [16, с. 118]. Утвараць сістэму могуць элементы, здольныя забяспечыць дасягненне агульнай для ўсёй сістэмы мэты. Сістэму, такім чынам, характарызуюць унутраная цэласнасць, упарадкаванасць і адносная ўстойлівасць.

З пазіцый сістэмнага падыходу публічная бібліятэка можа разглядацца не толькі ў якасці неад'емнай часткі ў адзінай і цэласнай сістэме экалагічнага выхавання падлеткаў, але і ў якасці адносна самастойнай сацыяэкалагічнай сістэмы.

Сістэмны падыход у экалагічным выхаванні падлеткаў-чытачоў дазваляе раскрыць адзінства і ўзаемасувязь такіх складовых, як інфармацыйныя рэсурсы па экалогіі, традыцыйныя і камп'ютэрныя тэхналогіі, кадравы патэнцыял супрацоўнікаў публічнай бібліятэкі, арганізацыйна-кіраўніцкі комплекс, гэта значыць усю разнастайнасць магчымасцей бібліятэкі ў фарміраванні і павышэнні экалагічнай культуры чытачоў-падлеткаў.

Такім чынам, педагагічныя падыходы, якія выкарыстоўваюцца ў дзейнасці бібліятэкі, з'яўляюцца фундаментам пры фарміраванні і ўдасканаленні экалагічнай культуры падлеткаў-чытачоў.

---

1. *Амонашвили, Ш.А.* Личностно-гуманная основа педагогического процесса / Ш.А.Амонашвили. – Мн.: Университетское, 1990. – 559 с.

2. *Оптимизация* учебно-воспитательного процесса: метод. рек. / сост. Ю.К.Бабанский, М.М.Поташник. – Гомель: Б.и., 1981. – 90 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3. Шимина, А.Н.* Педагогические аспекты философского наследия Э.В.Ильенкова / А.Н.Шимина // Педагогика. – 2004. – № 6. – С. 74–79.

*4. Караковский, В.А.* Воспитание для всех / В.А.Караковский. – М.: НИИ школьных технологий: Народное образование, 2008. – 238 с. – (Библиотечка журнала “Воспитательная работа в школе”).

*5. Сериков, В.В.* Личностный подход в образовании: концепция и технологии: монография / В.В.Сериков. – Волгоград: Перемена, 1994. – 149 с.

*6. Выготский, Л.С.* Психология развития ребенка: сборник / Л.С.Выготский. – М.: Эксмо, 2003. – 507 с. – (Серия “Библиотека всемирной психологии”).

*7. Гальперин, П.Я.* Психология как объективная наука: избр. психол. труды / П.Я.Гальперин; под ред. А.И.Подольского. – М.: МПСИ; Воронеж: МОДЭК, 2003. – 478 с. – (Серия “Психологи России”).

*8. Давыдов, В.В.* Деятельностная теория мышления / В.В.Давыдов. – М.: Научный мир, 2005. – 239 с.

*9. Леонтьев, А.Н.* Деятельность. Сознание. Личность: учеб. пособие по направлению и специальностям “Психология”, “Клин. психология” / А.Н.Леонтьев. – М.: Смысл: Академия, 2004. – 345 с.

*10. Рубинштейн, С.Л.* Основы общей психологии / сост., авт. коммент. и послесл. А.В.Брушлинский, К.А.Абульханова-Славская. – СПб.: Питер Ком, 1999. – 705 с. (Серия “Мастера психологии”).

*11. Беспалько, В.П.* Слагаемые педагогической технологии / В.П.Беспалько. – М.: Педагогика, 1989. – 190 с.

*12. Конаржевский, Ю.А.* Что нужно знать директору школы о системе и системном подходе / Ю.А.Конаржевский. – Челябинск: ЧГПИ, 1986. – 135 с.

*13. Кузьмина, Н.В.* Методы системного педагогического исследования / Н.В.Кузьмина. – Л.: Издательство ЛГУ, 1980. – 172 с.

*14. Сериков, Г.Н.* Образование: аспекты системного отражения / Г.Н.Сериков. – Курган: Зауралье, 1997. – 464 с.

*15. Юдин, Э.Г.* Системный подход и принцип деятельности: методологические проблемы современной науки / Э.Г.Юдин. – М.: Наука, 1978. – 391 с.

*16. Водзинский, Д.И.* Научные основы нравственного воспитания школьников: учеб. пособие для педагогических институтов / Д.И.Водзинский. – Мн.: Вышэйш. шк., 1982. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Сокольников, Ю.П.* Системный подход к воспитанию школьников: учеб.-метод. пособие / Ю.П.Сокольников. – М.: Прометей, 1990. – 90 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ